**Практычныя заданні па тэме “ПУНКТУАЦЫЯ”**

**(ІУ курс факультэта дашкольнай адукацыі)**

***Расставіць і растлумачыць знакі прыпынку ў тэкстах***

І. Сярод Рагвалодавых унукаў у ХІІ стагоддзі вылучаецца Ефрасіння Полацкая наша першая асветніца.Унучка Усяслава яна пераняла ад дзеда вялікі духоўны запал накіраваны на служэнне свайму народу. Прычыны з якіх Прадслава так звалі Ефрасінню ў мірскім жыцці пайшла ў манастыр застаюцца невядомымі. Магчыма гэта здарылася тады калі бацьку і маці як самых блізкіх людзей вывезлі ў Візантыю. Праўда выпадак як на той час беспрэцэдэнтным не назавеш ігуменняй манастыра дзе прыняла подстрыг Ефрасіння была яе родная цётка. Сям’я у якой Ефрасіння расла глыбокай рэлігійнасцю не вызначалася. Дастаткова прыгадаць што яе бацька больш вядомы сваім язычніцкім імем Святаслаў чым хрысціянскім Георгій. Тое самае можна сказаць пра Святаслава брата Ефрасінні які не менш вядомы нам пад язычніцкім найменнем Рагвалод. Не захавалася ў памяці народа хрысціянскае імя самога Усяслава хоць яно безумоўна было нададзена князю пры хрышчэнні. ( К.Тарасаў)

ІІ. Абапіраючыся на тонкія абчасаныя кімсьці жэрдкі знойдзеныя мусіць пад дзедавай паветкай каманда пераадольвала мяккі сыры мох і балацявінку і лясную з багністымі берагамі рачулку і нейкае азярцо з кладкамі схаванымі пад вадой і дрыгву якая зыбалася пад нагамі. Але ўсё як бы абыходзілася найлепшым чынам. Стары пракладваючы шлях ішоў наперадзе. Час ад часу ён гэты нечаканы праважаты папярэджваў дзе прыбавіць кроку а дзе ступаць не спяшаючыся. Апрача ўсяго калі траплялася дрыгва зыбкая з рудаватай вадой загадваў катэгарычным тонам падаваць жэрдкі ішоўшаму ззаду. Усе разумелі якая небяспека падпільноўвае як змяя кожнага з іх і моўчкі выконвалі парады-загады праваднікa. Балота не радасць і ўсе пераканаліся ў тым якой незаменнай рэччу могуць быць лыкавыя лапці. Сапраўды ногі ў іх то залелі то разаграваліся самі сабою і было відавочна хада нялёгкая рэч. Нечакана ў самым канцы шляху нізіны і балоты парослыя мохам з чэзлым сасоннікам змяніліся густым лазняком праз які праходзіла ледзь прыкметная сцяжынка. За лазняком злева стары густы яловы лес. На некаторых дрэвах былі паметы-засечкі. Яны вывелі падарожнікаў на невялікае роўнае ўзвышша парослае рэдкім відаць маладым сасняком. Стары з палёгкай уздыхнуў і сеўшы на трухлявае бервяно няспешна пачаў раскручваць аборы з лыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(А.Петрашкевіч)

III. Пакуль добра не сцямнела і была відаць дарога коні павярнулі ў поле. Узлесак застаўся ззаду і ў душы Бурава пачала расці трывога як бы не напароцца на ворагаў. Усё ж праз вярсту ад станцыі была паліцыя і невядома ці сядзіць яна зараз у сваім бункеры ці можа як і яны гойсае дзе па вёсках і заляжа ў засаду. Цяпер Бураў не падганяў кабылы і тая ішла як хацела а ён навастрыўшы зрок пільна ўглядаўся ў прырэчны хмызняк туды дзе калісьці была кладка. Хоць ён і нарадзіўся тут і вучыўся але з таго часу як бацька перабраўся з сям’ёй у мястэчка Бураў ні разу не завітаў сюды не было часу і патрэбы а затым на яго жыццёвым шляху была вайсковая служба на Далёкім Усходзе. І цяпер едучы па тутэйшых мясцінах ён ледзьве пазнаваў іх хоць яны і не надта змяніліся. Прынамсі узлесак дарога і поле былі як і некалі калісьці ён тут пасвіў жывёлу вазіў снапы і сена. Здаецца ў полі і ля ракі было пуста толькі ў прырэчным хмызняку варушылася на ветры непаседлівая чародка вераб’ёў ды каркалі вароны. Ён ужо згледзеў там Сушчэнеў агарод на якім стаялі два стажкі сена і ўбачыў па сцежцы што вяла да падворка ішла жанчына. Бураў ураз апрытомнеў і прыгнуўшыся скокнуў з воза. Хвіліна і ён за хвояй. Ужо адтуль згледзеў як пад’ехалі дзве фурманкі і з іх крадком ссыпаліся людзі якія шуснулі за канаву ў падлесак. ( В.Быкаў)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ